# Каб не паўтарылася...

81 год таму мірнае чэрвеньскае неба над нашай краінай закрыла крывавым крылом вайна. **1418 дзён** замест птушынага шчэбету гучаў плач, **аўтаматныя чэргі і выбухі...** Сёння амаль не засталося сведкаў тых страшных падзей, але жыве памяць.



У Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа палачане ў чарговы раз сабраліся ля падножжа Кургана Бессмяротнасці, каб ушанаваць подзвіг герояў, успомніць бязвінных ахвяр, скатаваных фашыстамі.

Удзел у патрыятычнай акцыі «Памяццю і смуткам мір пераможа вайну» прынялі старшыня Полацкага раённага Савета дэпутатаў Іосіф Грыбовіч, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Таццяна Полушкіна, старшыня РГА «Белая Русь», рэктар ПДУ Алег Раманаў, прадстаўнікі сілавых структур, следчага камітэта, пракуратуры, прадпрыемстваў і грамадскіх аб'яднанняў, ветэраны і моладзь, удзельнікі велапрабегу «Белая Русь памятае».

— *Наш свяшчэнны доўг — захаваць памяць пра подзвіг беларускага народа,* — звярнуўся да прысутных Іосіф Грыбовіч.

А Алег Раманаў у сваім выступленні зазначыў, што сучаснае пакаленне павінна не толькі ведаць сваю гісторыю, але і не дазваляць нікому скажаць яе. Падчас акцыі быў агучаны ход расследавання справы пра генацыд беларускага народа. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны Аляксандр Растапчын пажадаў моладзі быць годнымі дзедаў і прадзедаў.

... Хвіліна маўчання — і кветкі ляглі да падножжа Кургана Бессмяротнасці.

Пасля акцыі шматлікія удзельнікі велапрабегу «Белая Русь памятае», а іх было больш за 100, адправіліся па вуліцах горада. Ушанаваць подзвіг герояў сабраліся як прафесійныя спартсмены, так і аматары. Яны паказалі, што моц беларускага народа ў адзінстве.

Вуліцы, па якіх давялося праехаць веласіпедыстам, нягледзячы на сучаснае аблічча, застаюцца маўклівымі сведкамі Вялікай Айчыннай вайны. А фінальнай кропкай маршрута стала Алея Герояў Савецкага Саюза, дзе ўдзячныя нашчадкі ўсклалі кветкі.

**Валянціна ЛІПКО.**
**Фота Віктара ЧАРНЯЎСКАГА.**